Галубовіч Мацвей Міхайлавіч,
вучань V класа ДУА "Цяцерынская сярэдняя школа" Круглянскага раёна
(настаўнік – Скарабагатая Тамара Мікалаеўна)

# ШТО ТАКОЕ АДЗІНСТВА?

Блакіт нябёс, і белы бусел,
І кветкі ў полі, як абрус...
Мой край завецца Беларуссю,
А сам я – хлопчык-беларус

Я жыву ў невялікай беларускай весцы Цяцерына. Зусім звычайная вёсачка, але вельмі ганарацца яе жыхары сваімі прыгожымі лясамі, сваім возерам, сваім гістарычным мінулым і сваімі слаўнымі працавітымі людзьмі. У гэтай вёсачцы жыве ўся мая вялікая дружная сям'я. Нас у матулі з татам трое, а яшчэ ў гэтай вёсачцы жывуць мае любыя дзядуля і бабуля, у якіх мы заўсёды збіраемся разам.Калі ўзнікае ў мяне нейкае пытанне, я іду да бабулі.

– Бабуля, як расказаць пра адзінства? – неяк запытаў я.

Бабуля лагодна ўсміхнулася:

– Прыходзьце вечарам да мяне, там разбярэмся.

Я вельмі люблю бываць у бабулі. Люблю, як мы збіраемся разам і пячом бліны. Гэта ўжо стала добрай традыцыяй. Усім знаходзіцца справа: матуля з бабуляй завіхаюцца ля печы, дзед Міхалка прынёс загадзя добрых гарачых паленцаў, каб бліны былі ўдалымі. Мы з сястрою накрываем стол абрусам, і з нейкай томнай асалодай, як зачараваныя, глядзім на полымя і на гарачую патэльню, на якой, як нейкі цар, расце прыгажун-блін. Адзін за другім раскідваюцца яны вольна на ручніку. Цякуць ужо слінкі, нам не церпіцца. Бабуля тым часам расказвае нам пра бліны. Вось што цікавага я даведаўся ад яе: існуе меркаванне, што блін круглай формы ўвасабляе сонца. Мабыць, гэтым тлумачыцца традыцыя выпякаць бліны на святы, звязаныя з сонечным рытмам: Каляды, Вялікдзень, Купалле.

Ну вось бліны спечаны, матуля з бабуляй складваюць іх грудам на талерцы, і мы садзімся за стол. Нас тут сустракае не толькі смачны пачастунак, а яшчэ і цікавая пазнавальная гутарка. Бабуля распавядае мне пра тое, як жылі раней. Я з цікавасцю пазнаю з бабуліных вуснаў нашы родныя беларускія словы, якіх я не ведаў раней (аблавуха, кашуля, спадніца, камізэлька, шкарпэткі, пантофлі). Гэтыя словы здаюцца мне зычнымі, роднымі, як песні, якія з радасцю і натхненнем спявае мая бабуля. Я гляжу на бабулю і слухаю, як яна мілагучна пяе. Мы стараемся падпяваць ёй, калі ведаем песню. І я ўжо не пытаю, што такое адзінства. Мне здаеццца, што адзінства – гэта песня з розных галасоў. І каб яна гучала прывабна, весела,

складна, трэба пастарацца і шмат папрацаваць. І таму адзінства – гэта праца, гэта радасць сабрацца разам за адным сталом.

Вось я і думаю, мая працавітая сям’я – гэта кавалак адзінства. І другія сем’і маёй краіны таксама маленькія зярняткі цэлага, адзінага. А разам усе мы – магутная сіла. Адзінства робіць нас моцнымі. Разам мы здольны пераадолець любыя цяжкасці. Калі трэба, абараніць сваю Радзіму, стварыць лепшую будучыню для сябе.

Мы розныя, кожны з нас мае асабістыя  інтарэсы, схільнасці, аднак я перакананы, што традыцыі маёй сям’і, традыцыі маёй  краіны – гэта тое, што нас яднае, праслаўляе мяне і мой радавод, які з’яўляецца малой часткай маёй вялікай слаўнай Радзімы. А вось з такіх частак складаецца вялікі ўзор маёй роднай адзінай Беларусі.